Источник: **«Звязда» - 2012-12-11**

# Багушэвічы

**Францішак Багушэвіч — пачынальнік беларускай літаратуры і абуджальнік нацыянальнай свядомасці беларускага народа**

Францішак Багушэвіч з'яўляецца самай яркай фігурай у беларускай літаратуры XIX стагоддзя. Паэт, празаік, публіцыст, перакладчык. Ён па праве лічыцца адным з пачынальнікаў беларускай літаратуры, заснавальнікам грамадзянскай паэзіі на Беларусі. Яго ідэйная спадчына з'явілася фундаментам ідэалогіі беларускага нацыянальна-вызваленчага руху пачатку XX стагоддзя. Дзякуючы Францішку Багушэвічу ўпершыню ў гісторыі нашай краіны грамадскія і палітычныя ідэалы былі скіраваны на адраджэнне Беларусі, а не на адраджэнне Вялікага Княства Літоўскага або Рэчы Паспалітай, як гэта было ў дабагушэвічаўскі перыяд.

## Няпросты шлях да народа

Паэтычны дар, які пакінуў пясняр народных дум і спадзяванняў Францішак Багушэвіч, несумненна, з'яўляецца найкаштоўнейшым здабыткам айчыннай літаратуры. Але шлях твораў паэта да народа быў няпросты. Яго спадчына не дайшла да нас у поўным выглядзе. Пры жыцці паэта яго творы ў царскай Расіі былі забаронены. Асобнымі кнігамі выйшлі толькі ў час рэвалюцыі 1905—1907 гадоў, але неўзабаве былі арыштаваны. У Савецкай Беларусі ў 20-я гады зборнікі паэта былі выдадзены. Але ўжо праз некалькі гадоў уся творчасць паэта была абвешчана буржуазна-кулацкай і нацыяналістычнай і забаронена. Па сведчанні даследчыкаў творчасці паэта, 3 чэрвеня 1937 года Галоўліт БССР выдаў загад № 33, згодна з якім віленскія, ковенскія і нават перыяду БССР выданні твораў Францішка Багушэвіча павінны былі спальвацца. Вядомы цікавы факт, які сведчыць аб тым, што будучы кіраўнік Польшчы Юзэф Пілсудскі ў маладосці асабіста кіраваў кантрабандай "Дудкі беларускай" Багушэвіча з Кракава ў Беларусь. І толькі пасля 40-х гадоў аднавілася выданне твораў пісьменніка. Больш за тое, асобныя творы паэта былі ўключаны ў школьную праграму па беларускай літаратуры, што дало магчымасць дзецям пазнаёміцца са спадчынай слыннага класіка зямлі беларускай.




Захаваўся сямейны альбом Францішка Багушэвіча, а таксама яго эпісталярная спадчына. Цікавыя дакументальныя сведчанні абставін жыцця паэта, гісторыі напісання яго твораў захоўваюцца ў архівах Беларусі, Польшчы, Украіны і Літвы. Удзячныя нашчадкі ўшанавалі памяць паэта: у бары каля Кушлянаў устаноўлены камень-помнік Багушэвічу, камень Багушэвіча ёсць і ва ўрочышчы Лысая гара недалёка ад Кушлян на тэрыторыі Смаргонскага раёна Гродзенскай вобласці, на могілках каля вёскі Жупраны ўстаноўлены помнік паэту, у інтэр'еры Жупранскага касцёла ёсць мармуровая пліта з надпісам "Францішку Багушэвічу. 1840—1900. Сябры". У Жупранах устаноўлены бюст Багушэвіча і адкрыты музей Францішка Багушэвіча, у Кушлянах захавалася сядзіба, якая належала паэту (зараз там працуе Дом-музей Багушэвіча). У райцэнтры Гродзенскай вобласці — горадзе Смаргонь — усталяваны бронзавы помнік Францішку Багушэвічу. Ушаноўваецца памяць пра нашага слаўнага земляка і за межамі Беларусі: ва Украіне ў горадзе Нежыне на будынку, дзе вучыўся беларускі паэт, устаноўлена мемарыяльная дошка, яго імем названа вуліца ў горадзе Канатопе, памятная шыльда ўстаноўлена і ў вёсцы, дзе нарадзіўся паэт — у Свіранах (Літва). Адна з бібліятэк Літвы носіць імя паэта, вуліца Багушэвіча ёсць у літоўскім мястэчку Рукойні. У Вільні на месцы дома, у якім з 1884 па 1898 год жыў Багушэвіч, усталявана мемарыяльная шыльда.

**Святыя словы паэта**

Ігар Капылоў. Багушэвічы

Францішак Багушэвіч выдатна разумеў, што нацыянальная мова — найважнейшая форма выяўлення духоўнасці народа. Словы, пачэрпнутыя з народных моўных глыбінь і па-майстэрску апрацаваныя пісьменнікам, трывала ўвайшлі ў лексічны склад сучаснай беларускай мовы. Акрамя стварэння літаратурных твораў, паэт займаўся лексікаграфічнай працай: збіраў слоўнік беларускіх слоў. Уся творчасць паэта садзейнічала выпрацоўцы моўных нормаў і развіццю сучаснай беларускай мовы. А словы аб значнасці для народа нацыянальнай мовы, сказаныя Францішкам Багушэвічам у прадмове да зборніка "Дудка беларуская" ў 1891 годзе, застаюцца актуальнымі і сёння, хаця мінула больш за сто гадоў. Яны гучаць як своеасаблівы заклік шанаваць і развіваць беларускую нацыянальную культуру і яе першаэлемент — нацыянальную мову:

"Братцы мілыя, дзеці Зямлі-маткі маёй! Вам ахвяруючы працу сваю, мушу з вамі пагаварыць трохі аб нашай долі-нядолі, аб нашай бацькавай спрадвечнай мове, каторую мы самі ды і не адны мы, а ўсе людзі цёмныя "мужыцкай" завуць, а завецца яна "беларускай". Я сам калісь думаў, што мова наша — "мужыцкая" мова і толькі таго. Але, паздароў Божа добрых людцоў, як навучылі мяне чытаць, пісаць, з той пары я шмат гдзе быў, шмат чаго відзеў і чытаў: і праканаўся, што мова наша ёсць такая людская і панская, як і французская альбо нямецкая, альбо іншая якая. Чытаў я ці мала старых папераў па дзвесце, па трыста гадоў таму пісаных у нашай зямлі і пісаных вялікімі панамі, а нашай мовай чысцюсенькай, як бы вот цяпер пісалася. Увідзеўшы гэта, я часта думаў: Божа ж мой Божа! Што ж мы за такія бяздольныя?! Якаясь маленькая Булгарыя — са жменя таго народу — якіясьці харваты, чэхі, маларосы і другія пабратымцы нашыя... маюць па-свойму пісаныя і друкаваныя ксёнжачкі і газеты, і набожныя, і смешныя, і слёзныя, і гісторыйкі, і баечкі; і дзеткі іх чытаюць так, як гавораць, а ў нас як бы захацеў цыдулку ці да бацькі лісток напісаць па-свойму, дык можа б і ў сваёй вёсцы людзі сказалі, што "піша па-мужыцку" і як дурня абсмяялі б! Шмат было такіх народаў, што страцілі наперш мову сваю, так як той чалавек прад скананнем, катораму мову займе, а потым і зусім замёрлі... Не пакідайце ж мовы нашай беларускай, каб не ўмёрлі! Пазнаюць людзей ці па гаворцы, ці па адзежы, хто якую носе; ото ж гаворка, язык і ёсць адзежа душы... Можа, хто спытае: гдзе ж цяпер Беларусь? Там, братцы, яна, гдзе наша мова жывець: яна ад Вільні да Мазыра, ад Віцебска за малым не да Чарнігава, гдзе Гродна, Мінск, Магілёў, Вільня і шмат мястэчкаў і вёсак...". Радкі з гэтай прадмовы паэта ў наш час увекавечаны на будынку Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі.

**Радаслоўная Францішка Багушэвіча і паходжанне яго прозвішча**

Гісторыкі сведчаць, што па мацярынскай лініі Францішак Багушвіч паходзіць са шляхецкага роду, дзявочае прозвішча маці — Галаўня. Захаваліся актавыя кнігі, у якіх ёсць запіс, паводле якога значыцца, што продак паэта Антон Багушэвіч за 450 польскіх злотых набыў маёнтак Кушляны, або Мігуцяны, з сялянамі. А да гэтага род Багушэвічаў у пачатку XVIII стагоддзя жыў у Полацкім ваяводстве. У архіўных матэрыялах захаваўся запіс, згодна з якім "7 чэрвеня 1729 года Міхаіл Савіцкі падпісаў дароўную, згодна з якой маёнтак Шкірлава, або Бароўшчына, з вёскай Хвашчаны і Мышкавічы (разам з сялянамі) у Полацкім ваяводстве падараваў швагру свайму Юрыю Аўгусцінаву Багушэвічу і яго сыну Казіміру, а іншых яго сыноў Антона і Франца Багушэвіча грашыма адарыў". Сваякі паэта ў канцы XVIII стагоддзя былі запісаны шляхтай Віленскай губерні, а ў 1830 і 1845 гадах іх шляхецкія прывілеі пацвердзіў сенат геральдыі.

На вялікі жаль, прамыя нашчадкі паэта не прадоўжылі справу бацькі на ніве адраджэння беларушчыны.

Ігар Капылоў. Багушэвічы

Францішак Багушэвіч, як правіла, падпісваўся псеўданімамі: <I>Demos, Huszicz, Ten, Tamten Мацей Бурачок, Рэўка з-пад Барысава. Прозвішча *Багушэвіч* утворана на аснове асабовага мужчынскага імя *Богуш*, якое, у сваю чаргу, з'яўляецца скарочаным народным варыянтам старажытных поўных славянскіх імёнаў *Багуслаў, Багумір*. У старажытнасці такія імёны звычайна замацоўваліся за прадстаўнікамі вышэйшых саслоўяў.

**Сучасныя Багушэвічы**

Прозвішча *Багушэвіч* даволі часта сустракаецца ва ўсіх абласцях нашай краіны, але найбольш частае яно на Міншчыне і Гродзеншчыне: Баранавіцкі раён Брэсцкай вобласці; Верхнядзвінскі, Пастаўскі, Полацкі раёны Віцебскай вобласці; Рэчыцкі раён Гомельскай вобласці; Ашмянскі, Воранаўскі, Гродзенскі, Іўеўскі, Карэліцкі, Навагрудскі, Слонімскі, Шчучынскі раёны Гродзенскай вобласці; Барысаўскі, Клецкі, Мінскі, Пухавіцкі, Салігорскі, Слуцкі, Уздзенскі раёны Мінскай вобласці. Вядомае гэта прозвішча і на землях суседніх дзяржаў: Польшчы, Украіны, Расіі і Літвы.

Нярэдка адзначаецца імя *Богуш* і вытворнае ад яго прозвішча ў асновах назваў населеных пунктаў: вёска *Багушы* ў Брагінскім раёне Гомельскай вобласці, Баранавіцкім раёне Брэсцкай вобласці, Смаргонскім, Шчучынскім раёнах Гродзенскай вобласці, вёска *Багушоўка* ў Бабруйскім і Шклоўскім раёнах Магілёўскай вобласці, вёска *Багушова* ў Полацкім раёне Віцебскай вобласці, вёска *Багушэвічы* ў Глыбоцкім раёне Віцебскай вобласці, гарадскі пасёлак *Багушэўск* у Сенненскім раёне Віцебскай вобласці, хутар *Багушкі* ў Ашмянскім раёне Гродзенскай вобласці, вёска *Багушоўка* ў Гродзенскім раёне Гродзенскай вобласці.

**Ігар КАПЫЛОЎ**